Рэспубліка

## Маладзечанскія агледзіны

**Сярод 20 маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні лепшым названы Аляксандр Салаўёў**

Х Нацыянальны фестываль беларускай паэзіі і песні прайшоў у мінулую суботу ў Маладзечне. Адной з самых цікавых і хвалюючых яго падзей стаў Рэспубліканскі конкурс маладых выканаўцаў эстраднай беларускай песні, у якім за лаўрэацкія званні змагаліся 20 салістаў з усіх абласцей краіны і горада Мінска.

Уладальнікам конкурснага Гран-пры і прыза глядацкіх сімпатый стаў прадстаўнік Мінскай вобласці і ўраджэнец Маладзечна Аляксандр САЛАЎЁЎ **(на здымку)**. Малады чалавек — выпускнік Маладзечанскага музычнага вучылішча па класе вакалу і студэнт аддзялення эстрадных спеваў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Цяперашняя перамога – не першая ў яго творчым жыцці, ён лаўрэат многіх іншых песенных конкурсаў, з 10 гадоў займаецца ў эстраднай студыі горада Маладзечна пад кіраўніцтвам вядомага беларускага кампазітара Алены Атрашкевіч. Дарэчы, дзве яе песні на вершы паэта Васіля Жуковіча якраз і прынеслі перамогу ў конкурсе маладому салісту.

Разам з Аляксандрам Салаўёвым пераможцамі сталі яшчэ чатыры выканаўцы. Першае месца прысуджана Улляне Шэлах з Магілёўскай вобласці, другое заняла яе зямлячка Маргарыта Халатава, трэцяе – Дзяніс Вяршэнка з Гомельшчыны. Спецыяльны прыз імя народнага артыста СССР і Беларусі Уладзіміра Мулявіна за захаванне нацыянальных песенных традыцый атрымаў прадстаўнік Віцебскай вобласці Глеб Лапіцкі.

Як адзначыў пасля завяршэння конкурсу старшыня прафесійнага журы народны артыст Беларусі кампазітар Эдуард Зарыцкі, у параўнанні з мінулымі гадамі сёлетнія маладыя выканаўцы прадэманстравалі прыкметна больш высокую вакальную падрыхтоўку, а некаторыя з іх, на яго думку, маглі б пасправацца на сцэне і з прафесіяналамі айчыннай эстрады.

Цікава, што сярод удзельнікаў конкурсу былі і будучыя прадстаўнікі даволі далёкіх ад спеваў і музыкі спецыяльнасцей. Як слушна заўважыў з гэтай нагоды першы намеснік міністра культуры Беларусі Уладзімір Рылатка, маладзечанскі конкурс вельмі дэмакратычны, бо адна з галоўных яго мэт — звярнуць увагу маладых выканаўцаў да беларускай песні, каб песня на роднай мове заставалася ў іх жыцці і душы незалежна ад таго, прафесіяналамі якой галіны яны стануць надалей.

Памкненні, канечне, ухвальныя. Вось толькі з роднай мовай конкурс высвеціў сумную акалічнасць. Аддаючы перавагу ўдасканаленню вакалу і музычных апрацовак, выканаўцы часцяком пакідаюць па-за ўвагай тэксты песень. На працягу конкурсу са сцэны не раз гучала, рэжучы вуха, відавочная непісьменнасць, асабліва прыкметная і крыўдная побач з лепшымі ўзорамі беларускай песеннай спадчыны. На жаль, не многія з сучасных аўтараў песенных радкоў сёння могуць пахваліцца добрымі ведамі беларускай мовы.

Разам з конкурсам маладых выканаўцаў у ходзе маладзечанскага свята адбыліся выстаўка-кірмаш вырабаў майстроў народных рамёстваў, выступленні самадзейных творчых калектываў горада і раёна, сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі і кампазітарамі. Праўда, не надта спрыяла надвор'е мерапрыемствам на адкрытых пляцоўках. Але бліжэй да вечара і фінальнай кропкі фестывалю – пачатку гала-канцэрта "Зямля мая — песня" на Цэнтральнай плошчы горада – дождж, на радасць удзельнікаў і арганізатараў свята, усё ж сцішыўся. Як адзначаў, жартуючы, на гэты конт старшыня Маладзечанскага райвыканкама Генадзь Кучко, відаць, пачулі-такі яго гарачыя просьбы ў "нябеснай канцылярыі".

Трохгадзінны гала-канцэрт сабраў на імправізаванай сцэне артыстаў вядучых творчых песенных і танцавальных калектываў краіны, зорак беларускай эстрады, пераможцаў конкурсу маладых выканаўцаў і стаў дзякуючы таму самым відовішчным і масавым з усіх мерапрыемстваў фестывалю. Прыхільнікі беларускай эстрады маглі ўбачыць яго тэлетрансляцыю на наступны дзень. Праўда, самыя дасведчаныя меламаны вялікага захаплення на гэты конт не выказвалі, бо добра вядома, што калі на вялікім зборным канцэрце прысутнічаюць тэлекамеры, на сцэне амаль не застаецца гучання "жывых" галасоў і песень.

**Пункт гледжання**

У час Нацыянальнага фестывалю беларускай паэзіі і песні адбыўся першы выхад у свет нядаўна прызначанага на пасаду міністра культуры краіны Паўла Латушкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзелячыся думкамі з журналістамі, Павел Латушка адзначыў, што маладзечанскі фестываль — гэта вельмі важная традыцыя, захаванне якой знаходзіцца пад патранатам Прэзідэнта краіны, падтрымліваецца на рэспубліканскім і рэгіянальным узроўнях.

— Упэўнены, што Нацыянальны фестываль беларускай паэзіі і песні будзе праходзіць у Маладзечне і надалей, бо беларускае слова і песня – гэта тыя крыніцы, якія патрэбны нашай краіне і людзям, якія ў ёй жывуць, — падкрэсліў міністр і адзначыў, што для яго вельмі важна, каб у ментальнасці беларусаў было разуменне, што наш народ можа ганарыцца сваёй багатай культурай.

Як расказаў Павел Латушка, зараз, пасля прызначэння на новую пасаду, ён знаёміцца з той сітуацыяй, якая існуе ў падпарадкаванай яму галіне, хаця і прызнаўся, што слова "галіна" ў дачыненні да сферы культуры яму падаецца не надта правільным, "таму што культура – гэта ўсё тое, што вакол нас, што ўнутры нас, тое, з чым мы сустракаемся штодня".

Дата публикации: 16.06.2009

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ